# СКАРЫНА ФРАНЦЫСК – ЗАСНАВАЛЬНІК БЕЛАРУСКАГА І ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКАГА КНІГАДРУКАВАННЯ

*УО «Белорусский государственный университет информатики и радиоэлектроники»*
*г. Минск, Республика Беларусь.*
*Булицкая О.Е..*

*Парфенков В.Я. –к.и.н. доцент*

Францішак Скарына – мысліцель, пісьменнік, публіцыст, перакладчык, асветнік-гуманіст, доктар медыцыны, мастак і першадрукар – заснавальнік беларускага ўсходнеславянскага кнігадрукавання. Дакладнай даты яго нараджэння і смерці, на вялікі жаль , не захавалася. Мяркуецца, што ён жыў каля 1490- 1551 г.г.

Ф.Скарына паходзіў з купецкай сям'і з Полацка. Бацька Лука і старэйшы брат Іван займаліся оптавым гандлем скурай. Аднак юнага палачаніна цягнула да навукі. У Полацку закладваліся асновы светапогляду будучага вучонага. Не выключна, што пачатковую адукацыю стрымаў у Вільні. У 1504 г. паступіў у Кракаўскі універсітэт – адну са старэйшых і лепшых навучальных устаноў Еўропы. У Кракаўскім універсітэце займаўся на філасофскім факультэце. Менавіта тут, у час вучобы ўзнікла ў юнака высокародная задумка даць свайму народу кнігу на роднай мове. У снежні 1506 г. Ф.Скарына атрымаў ступень бакалаўра. З 1507 па 1511 гг. ен знік з нашага поля зроку. Верагодней за ўсе ен працягваў адукацыю ў адным з еўрапейскіх універсітэтаў, паглыбляў свае веды па філасофіі, гісторыі, медыцыне.

Восенню 1512 г. будучы сакратаром караля Даніі ен прыяджае ў Італію. У Падуанскім універсітэце паспяхова здае экзамен на званне доктара медыцыны.

У 1517-1519 гг. у Празе Ф.Скарына заклаў пачатак беларускаму і ўсходнеславянскаму кнігадрукаванню: выдаў 6 жніўня 1517 г. сваю першую кнігу – Псалтыр, а пазней 22 кнігі Біблії з уласнымі прадмовамі і пасляслоўямі пад агульнай назвай "Біблія руска". У канцы 1519 г. і ў пачатку 1520 г. Ф.Скарына вырашыў перанесці сваю друкарню на Усход у Вільню – сталіцу ВКЛ.

Прыкладна у 1525 г. Ф.Скарына ездіў у Маскву, намерваўся закласці новую друкарню, але з гэтага нічога не атрымалася.

У 1529 г. памірае жонка Ф.Скарыны. Пагаршаецца яго эканамічнае становішча. Жыццевыя неўзгоды прымусілі Ф.Скарыну у 1535 г. пакінуць Радзіму. Апошні перыяд свайго жыцця Ф.Скарына правеў у Празе. Памер ў канцы 1551 г. ці ў пачатку 1552 г. Месца пахаванне невядома.

Імя Ф.Скарыны ўвекавечана ў назвах вуліц беларускіх гарадоў. У Празе, Полацку, Мінску, Лідзе ўстаноўлены помнікі. У Вільнюсе дзейнічае Беларуская школа. У Лондане - беларуская бібліятэка і музей Ф.Скарыны.

Спіс літаратуры:

1. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Том 6. Мінск, 2001, с.309.
2. 250 асоб з Беларусі ў дыялогах культур. Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства "Пропемпечать". Мінск, 2008, с.12.
3. Галенчанка Г.Я. Францыск Скарына – беларускі і усходнеславянскі першадрукар. Мн., 1993.
4. Немировский Е.Л. Франциск Скорина: жизнь и деятельность бел. просветителя. Мн., 1990.